PATVIRTINTA
Nacionalinės švietimo agentūros direktoriaus
2024 m. gegužės 31 d. įsakymu Nr. VK-511

# 2023–2024 MOKSLO METŲ PAGRINDINĖS SESIJOS GIMTOSIOS KALBOS (BALTARUSIŲ) MOKYKLINIO BRANDOS EGZAMINO (II, III DALIŲ) KANDIDATŲ DARBŲ VERTINIMO INSTRUKCIJA

## NURODYMAI VERTINIMO KOMISIJAI

- Vertinimo komisijos darbą organizuoja vertinimo komisijos pirmininkas. Kiekvieną kandidato darbą vertina **ne mažiau kaip 2 vertintojai** vadovaudamiesi šia vertinimo instrukcija.
- Vertintojai ir vyr. vertintojai neskleidžia ir nekomentuoja informacijos, susijusios su vertinimu ir kandidatų darbų turiniu.
- Kiekvienam vertintojui pateikiama vertinimo instrukcija ir 2024 m. rašinio vertinimo lapai BaG-MBE (skelbiami informacinėje sistemoje NECIS). 2024 m. rašinio vertinimo lapas (BaG-MBE) yra skirtas vienam kandidato darbo įvertinimui įrašyti.
- Teksto suvokimo užduotis vertinama pagal vertinimo instrukciją. Jeigu atsakymas, vertinimo komisijos nuomone, yra teisingas arba iš dalies teisingas, bet formuluojamas kitais žodžiais, negu pateikta vertinimo instrukcijoje, skiriamas vertinimo instrukcijoje numatytas taškų skaičius. Neapvalintus taškus, skiriamus už teksto suvokimo dalį vertinimo komisijos pirmininkas įrašo lentelėje (8 psl.), suskaičiuoja taškų sumą, suapvalina ir ją užrašo sąsiuvinio viršelyje esančioje lentelėje.
- Vertinant teksto kūrimo užduotį pagal III kriterijų (Stiliaus vertinimas) ir IV kriterijų (Raštingumo vertinimas) kandidato darbas vertinamas tik iki minimalios rašinio žodžių ribos (250 žodžių).
- Turinio, kalbos taisyklingumo bei teksto raiškos ir formaliojo vientisumo trūkumus, visas rašybos, skyrybos, gramatikos ar žodyno **klaidas vertintojai žymi** sutartiniais ženklais **tik** kandidato darbo **paraštėse**. Juodraštis netikrinamas. Vertintojai rašo kandidato darbe **skirtingų spalvų rašikliais**.
- Patikrinęs darbą, vertintojas suskaičiuoja kiekvienos rūšies klaidas ir pagal šioje instrukcijoje pateiktas vertinimo lenteles nusprendžia, kiek taškų galima skirti už vieną ar kitą vertinimo aspektą. Šiuos taškus įrašo vertinimo lape, suskaičiuoja taškų sumą ir pasirašo. Vertinimo lape vertintojas taip pat turi pažymėti laukelio „Vertinimas“ atitinkamą skiltį (1, 2 ar 3), kuri parodo, kelintą kartą vertinamas darbas.
- Jeigu dviejų vertintojų abiejų egzamino dalių įvertinimai skiriasi **2 taškais ir daugiau**, vertinimo komisijos pirmininkas darbą peržiūri dar kartą ir nutaria dėl galutinio įvertinimo. Jei įvertinimas skiriasi mažiau nei 2 taškais, galutiniu laikomas antrasis įvertinimas.
- Vertinimo lapai saugomi kartu su kandidatų darbais.

## VISO EGZAMINO REZULTATŲ ĮFORMINIMAS

1. Vertinimo komisijos pirmininkas rašinio įvertinimo pagal kiekvieną aspektą taškus įrašo kandidatų gautų taškų suvestinės blanke, gautame iš Nacionalinės švietimo agentūros informacinės sistemos NECIS.
2. Vertinimo komisijos pirmininkas užpildytą kandidatų gautų taškų suvestinės blanką perduoda asmeniui, atsakingam (toliau – atsakingas asmuo) už darbą su slaptažodžiu apsaugota informacine sistema NECIS.
3. Atsakingas asmuo suveda rezultatus į duomenų perdavimo sistemą NECIS ir išspausdina kandidatų gautų taškų suvestinės juodraštį. Vertinimo komisijos pirmininkas patikrina. Atsakingas asmuo, jei reikia, informacinėje sistemoje NECIS ištaiso netikslumus, patvirtina įvestus duomenis ir išspausdina gautų taškų suvestinę, kurią vertinimo komisijos pirmininkas patvirtina savo parašu.
4. Vertinimo komisijos pirmininko parašu patvirtinta kandidatų gautų taškų suvestinė perduodama mokyklos vadovui.

## II egzamino dalis

## TEKSTO SUVOKIMAS

АЦЭНКА ВЫКАНАННЯ ТЭСТА (30 балаў)

| № | Магчымыя адказы | Нормы ацэнкі | Балы |
|---|---|---|---|
| 1* | Дэтокс-кампанія – гэта змяншэнне затручвання навакольнага асяроддзя хімічнымі рэчывамі, якія выкарыстоўваюцца буйнымі прамысловымі кампаніямі па вытворчасці адзення. | Адказ правільны.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br>0 |
| 2* | “Грынпіс” правёў даследаванне, якое пацвердзіла наяўнасць у прадукцыі многіх гігантаў causal-індустрыі наніфенол-этаксілатаў (таксічных рэчываў). | Адказ правільны.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br>0 |
| 3 | <u>Для вытворцаў адзення</u>:<br>1) адыход ад тэхналогій, якія забруджваюць асяроддзе;<br>2) экалогія сёння – гэта мода і дадатковая рэклама для фірм, якія далучаюцца да дэтокс-кампаніі.<br><u>Для спажыўцоў</u> – гэта інфармацыя пра хімічны састаў матэрыялаў, з якіх зроблена адзенне, ахова навакольнага асароддзя. | 1 бал за адно правільнае тлумачэнне. | 3 |
| 4 | 1. Выкарыстанне другасных матэрыялаў (у тэксце бутэлькі).<br>2. Матэрыялы пастаўляюцца спецыяльнымі эка-фермамі. | За кожны правільны адказ 0,5 бала. | 1 |
| 5 | 1 – развіццё канкурэнцыі.<br>2 – развіццё тэхналогій. | За кожны правільны адказ 0,5 бала. | 1 |
| 6* | Адказы могуць быць розныя. Напрыклад:<br>- Асабіста я да эка-кампаній адношуся станоўча. Таксама стараюся клапаціцца пра прыроду: збіраю макулатуру, сартую смецце, ашчадна падыходжу да выкарыстання вады і святла.<br>- Мне здаецца, што яшчэ не надышоў час для рэкламы і пашырэння такіх кампаній, таму што ў свеце шмат людзей, якія галадаюць і нават паміраюць ад голаду. У многіх краінах людзям не хапае пітной вады. Таму ў першую чаргу трэба думаць, як вырашыць гэтыя праблемы. | За выразна выказаную пазіцыю і два аргументы.<br>За выразна выказаную пазіцыю і адзін аргумент.<br>Толькі выразна выказана пазіцыя ці прыведзены толькі адзін аргумент.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 3<br>2<br>1<br>0 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 7 | 1 – вырошчваюць расліны і жывёлу без выкарыстання хімічных угнаенняў, генетычных і гарманальных стымулятараў;<br>2 – не выкарыстоўваюць паліўную энэргію і іншыя тэхналогіі, што забруджваюць навакольнае асяроддзе;<br>3 – забяспечваюць годныя ўмовы працы людзей на прадпрыемстве. | За кожны правільны адказ 0,5 бала. | 1,5 |
| 8 | Публіцыстычны. | Адказ правільны.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br>0 |
| 9 | Трэнд, матэрыял, рытэйлер, фабрыка, кампанія, таксічны, індустрыя, тэхналогія, хімічны, лідар, рэсурс.<br>*Могуць быць прыведзены іншыя прыклады.* | За кожны правільны прыклад 0,5 бала. | 2 |
| 10 | Могуць быць варыянты:<br>- Мастацтва і чалавек.<br>Уплыў мастацтва на асобу. | Адказ правільны.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br>0 |
| 11.1 | Спачатку настрой радасны, святочны, нічым не засмучаны, у канцы твора гераіня разгублена, збянтэжана. | Адказ правільны.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br>0 |
| 11.2 | Настрой гераіні ў пачатку тэксту:<br>1- *далікатныя букецікі* ландышаў;<br>2- *цнатліва-чыстыя* кветкі;<br>3- незвычайна *тонкі водар* гэтых мілых кветак.<br>Настрой гераіні ў канцы тэксту:<br>*горка пахнуць* у маіх руках ... ландышы. | За кожны правільны прыклад эпітэта 0,5 бала. | 2 |
| 12 | І тваё, тваё, тваё. | Адказ правільны.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 0,5<br>0 |
| 13 | Тут найперш была роднасць, тут найперш было яднанне тваёй душы з тым светам, у які цябе нязмушана, але настойліва вёў мастак. Гэта быў твой свет. | Адказ правільны.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 0,5<br>0 |
| 14 | духоўнае ўзрушэнне; высокае, ні з чым не параўнальнае перажыванне. | За два правільныя адказы.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br>0 |
| 15 | **Г** Дапамагае ёй адчуць сувязь з мінулым, прыналежнасць да свайго роду. | Адказ правільны.<br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | | 0 |
| 16* | Віктар называе карціны састарэлымі, несучаснымі. Ён прапаноўвае прывесці сваю бабулю, кажучы, што ёй бы гэтыя карціны спадабаліся. | Адказ правільны.<br><br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br><br>0 |
| 17* | Адказы могуць быць розныя. Напрыклад: Ацэнка Віктарам карцін стала вельмі нечаканай, можа, нават, грубай для гераіні, кантрасціравала з яе ўласнымі ўражаннямі. | Адказ правільны.<br><br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br><br>0 |
| 18 | **Г** Мастацтва дапамагае нам зразумець сябе, знайсці сувязь з мінулым і сучаснасцю, перажыць моцныя эмоцыі. | Адказ правільны.<br><br>Адказ няправільны, або адказу няма. | 1<br><br>0 |
| 19 | **Б** Падзеі ў творы адбываюцца ў пачатку восені.<br>**В** Віктару і гераіні спадабаліся розныя карціны.<br>**Г** Выстаўка фатаграфій праходзіла ў Палацы мастацтваў. | За кожны правільны адказ 0,5 бала. | 1,5 |
| 20 | яканне: вясною, вясёлыя, бяда,<br>дзеканне: глядзеў, дзень, людзей, дзіўнае, як-небудзь;<br>цеканне: букецікі, цябе, свеце, ціхі, цёплы;<br>падаўжэнне зычных: развінуцца, падабаецца, узрушэнне, здаецца, яднанне, адчуванне.<br>*Могуць быць прыведзены іншыя прыклады.* | За кожны правільны прыклад 0,5 бала. | 4 |

**III egzamino dalis**

**TEKSTO KŪRIMAS**

АЦЭНКА САЧЫНЕННЯ (ІНТЭРПРЭТАЦЫІ)

- Недахопы ў сачыненні (інтэрпрэтацыі) правяраючыя адзначаюць на палях вучнёўскай працы. Чарнавік не правяраецца.
- Умоўныя абазначэнні: I – арфаграфічная памылка, V – пунктуацыйная, Г – граматычная, М – моўная, Лг – лагічная, С – стылістычная, Ф – фактычная.
- Не забудзьце падлічыць колькасць памылак кожнага віду і ўпісаць балы ў табліцу на тытульным лісце вучнёўскай працы ў адпаведнасці з прыведзенымі ніжэй крытэрыямі

1.1. АЦЭНКА ЗМЕСТУ САЧЫНЕННЯ (20 балаў)

| Крытэрыі | Апісанне крытэрыяў | Балы |
|---|---|---|
| 1.1.1. Разуменне тэмы, яе раскрыццё | Тэма зразумета правільна, раскрыты ўсе асноўныя яе кампаненты. | 5–4 |
| | Сачыненне адпавядае тэме, аднак недастаткова поўна яе раскрывае. | 3–2 |
| | Тэма недакладна зразумета, дрэнна раскрыта. | 1 |
| | Сачыненне не адпавядае тэме. | 0 |
| 1.1.2. Асноўная думка сачынення | Асноўная думка зразумелая і лагічна аргументаваная. Дэманструецца ўменне лагічна разважаць, да месца прыводзіць аргументы, абагульняць / рабіць высновы, спалучаць разважанне з элементамі апісання і апавядання. | 6–5 |
| | Асноўная думка зразумелая, аднак не ўсе палажэнні дастаткова аргументаваныя. Часам парушаецца логіка разважання / ёсць памылкі ў фармуляванні высноў. | 4–3 |
| | Асноўная думка недастаткова зразумелая, большасць аргументаў не адпавядае палажэнням. Аўтар сачынення абмяжоўваецца пераказам сюжэта твора альбо зместу крытычнага артыкула. | 2–1 |
| | Адсутнічае галоўная думка сачынення, не дэманструецца ўменне разважаць. | 0 |
| 1.1.3. Ацэнка, самавыяўленне | Пазіцыя і адносіны аўтара сачынення зразумелыя і дастаткова абгрунтаваныя. | 3–2 |
| | Пазіцыя і адносіны аўтара сачынення не заўсёды зразумелыя ці непаслядоўныя. | 1 |
| | Пазіцыя аўтара сачынення незразумелая / не выказана. | 0 |
| 1.1.4. Выкарыстанне ведаў па тэорыі літаратуры | Дэманструецца ўменне аналізаваць сістэму вобразаў / мастацкія асаблівасці / мову твора, эрудыцыя / уменне выйсці на літаратурны / культурны / гістарычны кантэкст. Да месца ўжыты цытаты / спасылкі на тэкст, літаратуразнаўчая тэрміналогія. | 6–5 |
| | Дапускаюцца памылкі пры аналізе мастацкіх асаблівасцей твора, выкарыстанні літаратуразнаўчай тэрміналогіі / цытаты альбо спасылкі на тэкст ужыты не заўсёды да месца. | 4–3 |
| | Дэманструецца здавальняючае веданне тэксту твора, не больш за 3 фактычныя памылкі. Не ўпамінаецца культурна-гістарычны кантэкст. | 2–1 |
| | Не дэманструецца веданне тэксту твора / творчасці пісьменніка / кантэкста эпохі. Больш за 3 фактычныя памылкі. | 0 |

**Увага:**

1. Калі сачыненне напісана не на ўказаную тэму, то III частка экзамену ацэньваецца ў 0 балаў.
2. **Калі ў працы менш за 200 слоў, то III частка экзамену ацэньваецца ў 0 балаў.**

1.2. АЦЭНКА ЗМЕСТУ ІНТЭРПРЭТАЦЫІ (20 балаў)

| Крытэрыі | Апісанне крытэрыяў | Балы |
|---|---|---|
| 1.2.1. Разуменне тэм, праблем, сэнсу аналізуемага тэксту | Тэмы / праблемы, сэнс аналізуемага тэксту раскрыты правільна і поўна. Дэманструецца ўменне вылучаць галоўныя думкі тэксту. | 4–3 |
| | Тэмы / праблемы, сэнс аналізуемага тэксту вызначаны не зусім правільна. | 2–1 |
| | Тэмы / праблемы, сэнс аналізуемага тэксту не раскрыты. | 0 |
| 1.2.2. Логіка разважання | Дэманструецца ўменне лагічна і паслядоўна развіваць думку, разважаць, прыводзячы ўдалыя аргументы, цытаты, абагульняць, рабіць высновы. | 6–5 |
| | Дэманструецца ўменне разважаць, аднак часам галоўная думка губляецца / некаторыя аргументы непераканаўчыя / цытаты не заўсёды адпавядаюць палажэнням разважання. | 4–3 |
| | Прысутнічаюць элементы разважання, аднак яны носяць выпадковы характар, не заўсёды аргументаваныя / цытаты не адпавядаюць палажэнням разважання. | 2–1 |
| | Адсутнічае логіка ў разважаннях. | 0 |
| 1.2.3. Ацэнка, самавыяўленне | Пазіцыя і адносіны аўтара інтэрпрэтацыі зразумелыя і аргументаваныя. | 3–2 |
| | Пазіцыя аўтара інтэрпрэтацыі не заўсёды зразумелая ці непаслядоўная. | 1 |
| | Пазіцыя аўтара інтэрпрэтацыі незразумелая / не выказана. | 0 |
| 1.2.4. Выкарыстанне ведаў па тэорыі літаратуры | Дэманструецца ўменне аналізаваць сістэму вобразаў / мастацкія асаблівасці / мову твора, эрудыцыя / уменне выйсці на літаратурны / культурны / гістарычны кантэкст. Да месца ўжыты цытаты / спасылкі на тэкст, літаратуразнаўчая тэрміналогія. | 7–6 |
| | Дэманструецца ўменне аналізаваць сістэму вобразаў / структуру / мову / мастацкія асаблівасці тэксту, аднак аналіз не заўсёды правільна суаднесены з сэнсам тэксту. 2–3 памылкі ў выкарыстанні літаратуразнаўчай тэрміналогіі. Не да месца / недастаткова ўжываюцца цытаты. | 5–4 |
| | Зроблены частковы аналіз тэксту, аналіз не суаднесены з сэнсам твора. Дамінуе пераказ тэксту. Больш за 3 недахопы ў выкарыстанні літаратуразнаўчай тэрміналогіі. Адсутнічаюць / не да месца ўжытыя цытаты. | 3–2–1 |
| | Не аналізуецца сістэма вобразаў / мова / мастацкія асаблівасці тэксту. Адсутнічаюць цытаты. | 0 |

## 2. АЦЭНКА СТРУКТУРЫ ТЭКСТУ (4 балы)

| Крытэрыі | Апісанне крытэрыяў | Балы |
|---|---|---|
| 2.1. Кампазіцыя тэксту | Прысутнічаюць усе тры структурныя часткі (уступ, асноўная частка, заключэнне), яны звязаны паміж сабой, вытрыманы іх прапорцыі. | 1 |
| | Адсутнічаюць тыя ці іншыя структурныя часткі альбо відавочна парушаны іх прапорцыі. | 0 |
| 2.2. Звязнасць тэксту і абзацаў | Тэкст вызначаецца сэнсавай завершанасцю і адзінствам, няма неапраўданых паўтораў, адступленняў ад тэмы. Абзацы звязаны ў адзіны тэкст і паміж сабой, усе сказы кожнага абзаца падпарадкаваны яго галоўнай думцы. | 3 |
| | Парушаецца сэнсавае адзінства тэксту, ёсць неапраўданыя паўторы, абзацы не заўсёды звязаны паміж сабой, сустракаюцца адступленні ад тэмы. | 2–1 |
| | У тэксце адсутнічае сэнсавае адзінства, абзацы не звязаны паміж сабой. | 0 |

## 3. АЦЭНКА СТЫЛЮ (4 балы)

| Крытэрыі | Апісанне крытэрыяў | Балы |
|---|---|---|
| 3.1. Стыль мовы | Стыль мовы адпавядае сітуацыі. Тэкст вызначаецца стылістычным адзінствам. Дэманструецца лексічнае багацце мовы і ўменне карыстацца яе вобразнымі сродкамі (эпітэтамі і г. д.). Сінтаксічныя канструкцыі вызначаюцца разнастайнасцю. | 4 |
| | Стыль мовы адпавядае сітуацыі, аднак ёсць некаторыя парушэнні стылістычнага адзінства, якія перашкаджаюць чытачу правільна ўспрымаць тэкст. Лексіка, сінтаксічныя канструкцыі не вызначаюцца разнастайнасцю. | 3–2 |
| | Відавочнае парушэнне стылістычнага адзінства. Лексіка, стылістычныя канструкцыі аднастайныя. | 1 |
| | Відавочная адсутнасць стылістычнага адзінства, лексічная беднасць, прымітыўнасць сінтаксічных канструкцый. | 0 |

## 4. НОРМЫ АЦЭНКІ ГРАМАТНАСЦІ (12 балаў)

| 1. Граматычныя і лексічныя памылкі | Балы | 2. Арфаграфічныя памылкі | Балы | 3. Пунктуацыйныя памылкі | Балы |
|---|---|---|---|---|---|
| 0–2 | 6 | | | | |
| 3–5 | 5 | | | | |
| 6–8 | 4 | | | | |
| 9–11 | 3 | 0–2 | 3 | 0–2 | 3 |
| 12–14 | 2 | 3–5 | 2 | 3–5 | 2 |
| 15–17 | 1 | 6–8 | 1 | 6–8 | 1 |
| больш за 17 | 0 | больш за 8 | 0 | больш за 8 | 0 |

**Увага:**

1. Калі паўтараецца лексічная, граматычная, арфаграфічная ці пунктуацыйная памылка, то яна лічыцца адной тыповай памылкай.
2. Калі адсутнічае адна ці дзве коскі, што павінны адасабляць з двух бакоў адну сінтаксічную канструкцыю, гэта лічыцца адной пунктуацыйнай памылкай.
3. Калі ў тэксце неаднаразова паўтараюцца графічныя недахопы, напрыклад, адсутнічае знак ͝ над літарай Й, гэта лічыцца адной арфаграфічнай памылкай.
4. Калі аб’ём працы меншы за 250 слоў, то за кожныя недастаючыя 25 слоў здымаецца па аднаму балу за граматнасць. Калі аб’ём працы меншы за 200 слоў, то III частка экзамену ацэньваецца ў 0 балаў.

| Колькасць недастаючых слоў | Колькі балаў здымаецца |
|---|---|
| 1–25 | 1 |
| 26–50 | 2 |
| больш за 50 | Праца ацэньваецца ў 0 балаў |